Янкавяк, Міраслаў. Славянская спадчына ў Латгаліі як аб’ект турызму /Міраслаў Янкавяк // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. — Минск: БГУ, 2011. — С. 256 – 259

**МІРАСЛАЎ ЯНКАВЯК**

# СЛАВЯНСКАЯ СПАДЧЫНА Ў ЛАТГАЛІІ ЯК АБ’ЕКТ ТУРЫЗМУ

Палітычныя перамены пачатку 90-х гг. XX ст. прычыніліся да лепшага развіцця турыстычнага руху на тэрыторыі даўняга Савецкага Саюза. Новыя, ужо незалежныя краіны адкрылі свае межы для турыстаў з Цэнтральнай ды Заходняй Еўропы.

Несумненна, адным з самых цікавых месцаў з’яўляецца рэгіён Усходняй Латвіі – Латгалія. Спецыфіка Латгаліі заключаецца ў наступным:

- Латгалія – гэта своеасаблівая *terra incognita*, пра якую цяжка даведацца ў розных турыстычных фірмах;
- гэта забыты рэгіён, пры чым не толькі шведамі, немцамі, палякамі ды рускімі, якія кіравалі гэтымі землямі раней, але і самымі латышамі: без вялікіх праблем можна знайсці прыгожыя месцы, дзе амаль няма турыстаў;
- Усходняя Латвія з’яўляецца экалагічна чыстым рэгіёнам.

Спецыфіка Латгаліі выклікана яшчэ іншымі фактарамі. Перадусім, гэта памежная тэрыторыя, на якой сутыкаліся і ўвесь час сутыкаюцца славяне і балты. Гэтыя землі з даўніх часоў вылучаюцца разнароднасцю. Тут жывуць латышы (у гэтым ліку і латгальцы), рускія, палякі, беларусы, цыгане, літоўцы ды іншыя нацыянальнасці, прадстаўнікі розных веравызнанняў: каталікі, праваслаўныя, лютэране, стараверы. Так вялікая разнароднасць не магла не паўплываць на мясцовую культуру – мову, архітэктуру і народную творчасць.

**Полікультурнасць Латгаліі.** Асаблівую ўвагу сярод розных народаў, якія пражываюць ва Усходняй Латвіі заслугоўваюць рускія, палякі і беларусы, што складаюць там большасць. Пачаткі кантактаў балтаў з усходнімі славянамі сягаюць сярэднявечча, калі ўсходнеславянскія плямёны, перадусім племя крывічоў, займаліся гандлем, выкарыстоўваючы раку Дзвіну (т. зв. «шлях з варагаў да грэкаў») [15, С. 17, 18]. З цікавых момантаў трэба адзначыць балцкія гарады-княствы Кукенойс і Герцыке, якія былі залежнымі ад Полацкага княства, а ў X ст. уладаром краслаўскіх зямель была дачка полацкага князя Рагнеда, будучая жонка князя Уладзіміра Вялікага [16, С. 2; 1, С. 25, 26].

Першая вялікая хваля міграцыі рускіх пачалася ў XVII ст., калі стараверы ўцякалі ад праследу царскіх улад, шукаючы прытулку ў Рэчы Паспалітай [7, с. 46]. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай у Латгалію пачалі прыязджаць



праваслаўныя рускія. Перад Першай сусветнай вайной у Латвіі было ўжо 150 тыс. рускіх, у 1935 г. – 206,5 тыс. Чарговая вялікая хваля міграцыі адбывалася пасля Другой сусветнай вайны. У 1989 г. у гэтай краіне пражывала 905 тыс. [гл.: 9, с. 33–38; 13; 14, С. 81–116].

Пра першае значнае перасяленне з беларускіх земель, галоўным чынам сялян, можна казаць у другой палове XIX ст.: пасля адмены прыгоннага права. З 1802 г. Латгалія была часткай Беларускай, а пазней Віцебскай губерні, у 1865 г. пракладзена чыгунка Віцебск-Дынабург [18, с. 324, 325; 12, с. 616]. Першы расійскі перапіс 1897 г. паказаў, што на латвійскіх землях пражывала 82 тыс. беларусаў. Чарговыя хвалі міграцыі адбыліся пасля Другой сусветнай вайны, калі беларусы перасяляліся ў Латвію дзеля працы ў калгасах, саўгасах і ў прамысловасці. У 1989 г. у гэтай рэспубліцы было амаль 120 тыс. беларусаў [больш у: 17; 2; 4, с. 44].

Польскую меншасць у Латгаліі можна лічыць аўтахтонным насельніцтвам. Яе колькасць не змянялася на працягу стагоддзяў. Палякі з’явіліся ў Латгаліі ў другой палове XVI ст., калі Ордэн мечаносцаў стаў васалам Рэчы Паспалітай у 1562 г. Пачаткова гэта былі перасяленцы з цэнтральнай (этнічнай) Польшчы і асобы, якія прыехалі працаваць у адміністрацыі. Другая група палякаў – гэта нямецкія ды шведскія магнацкія сям’і, якія з часам прынялі каталіцтва і спаланізаваліся, а разам з імі, з часам, і частка сялянскага насельніцтва [больш у: 5; 3, с. 157–171; 8]. У 1935 г. у Латвіі пражывала амаль 49 тыс. палякаў, у 1989 г. – 60,1 тыс., у 2005 г. – 56,5 тыс. [6, с. 45].

**Славянская спадчына як аб’ект турызму.** З турыстычнага пункту гледжання, для наведвальнікаў цікавымі аб’ектамі могуць быць: архітэктурныя помнікі (сакральныя, свецкія пабудовы – палацы, а таксама звязаныя з вайсковай дзейнасцю), агратурызм, дзе госць можа сутыкнуцца з народнай культурай і творчасцю. Але асаблівую ўвагу заслугоўвае прырода. У Латгаліі найбольш турыстычных аб’ектаў звязаных з рускай і польскай спадчынай, на шмат меней – з беларускай.

З царскімі часамі звязана такая вайсковая архітэктура, як, напрыклад, крэпасць у Дынабургу. Яна пабудавана пры Аляксандры I і Мікалаю I (1810–1833 гг.). Там захаваліся абарончыя валы, цытадэль і восем бастыёнаў [10, с. 249]. Для турыстаў з Заходняй Еўропы цікавасць можа прадстаўляць архітэктура савецкіх часоў (пабудовы сталінскага тыпу ці так званыя хрушчоўкі), якіх шмат у Дынабургу, Краславе, Рэзэкне ці Лудзы. Варта звярнуць увагу на сэцэсійныя пабудовы Рыжскай вуліцы ў Дынабургу. Да сённяшняга часу знаходзяцца ў латгальскіх гарадах рознага тыпу помнікі, прысвечаныя савецкім салдатам, якія вызвалялі Латвію ад нямецкай акупацыі.

З перасяленнямі праваслаўных звязана таксама сакральная архітэктура. Раней у Латгаліі жылі амаль толькі католікі і стараверы. У царскі час трэба было даць магчымасць праваслаўнаму насельніцтву практыкаваць сваю веру, выкарыстоўваючы, напрыклад, ужо існуючыя каталіцкія касцёлы. Так было, напрыклад, з царквой Аляксандра Неўскага ў Краславе, якую праваслаўныя веруючыя атрымалі ад улад пасля паўстання 1863 г. Раней у будынку з 1789 г. знаходзілася каталіцкая



капліца [11, с. 176]. Праваслаўныя цэрквы існуюць таксама ў іншых гарадах: Дынабургу (царква Барыса і Глеба, 1655/1905 г.), Педруі (Мікалаеўская царква, пачаткова уніяцкая, II пал. XVIII ст.), Лудзе (царква Успення Багародзіцы, 1843 г.) ці Рэзэкне (сабор Нараджэння Багародзіцы, 1840 г.).

У Латгаліі шмат месцаў звязаных з палякамі. Нямецкія ці шведскія сем'і Плятэраў, Зыберкаў ды Мантойфляў, якія з часам прынялі «польскую веру» і культуру, пабудавалі многа палацаў і шляхецкіх сядзіб, якія захаваліся да сённяшняга дня. Выдатным прыкладам гэтай архітэктуры з'яўляецца палац Плятэраў у Краславе, пабудаваны ў 1750–1791 гг. у стылі класіцызму. Унутры знаходзяцца фрэскі позняга барока, адзіныя ў Латгаліі [11, с. 174]. Варта звярнуць увагу таксама на помнікі палякам, якія ў 1920 г. разам з латышамі вызвалялі Латгалію ад бальшавікоў. Аб'ектам турызму з'яўляюцца каталіцкія касцёлы – св. Людвіка ў Краславе (1755–1767 г.), базіліка ў Аглоне (1768–1800) – найважнейшае месца пілігрымак каталікоў з Латвіі і Паўночнай Беларусі, а таксама касцёл у Педруі другой паловы XVIII ст.

Важным элементам польскай спадчыны з'яўляюцца легенды і паданні, якія тычацца, галоўным чынам, сям'і Плятэраў і якіх шмат захавалася ў Латгаліі.

Турыстычнымі аб'ектамі можа з'яўляцца не толькі архітэктура, але таксама прырода і народная культура. Дзякуючы таму, што ў Латгалію не трапілі яшчэ вялікія грошы на пабудову сучаснай інфраструктуры, а насельніцтва не надта багатае, у такіх гарадках, як Краслава, можна пабачыць шмат драўляных дамоў з пераломy XIX–XX стст., у якіх жылі і ўвесь час жывуць рускія-стараверы і беларусы. Спосаб пабудовы, колер ці аздоба (напрыклад, аконніцы) выдатна адлюстроўваюць багаццё традыцыйнай культуры ўсходнеславянскага насельніцтва [11, с. 172].

Цікавым дадаткам для турыстаў у час наведвання Латгаліі могуць быць рознага тыпу фестывалі і святы, якіх хапае ва Усходняй Латвіі. Выдатны прыклад такога мерапрыемства – Свята агуркоў у Краславе, якое адбываецца заўсёды ў ліпені. Арганізатары, чэрпаючы поліэтнічнае багацце гарадка, запрашаюць гурты з розных краін – латвійскія, беларускія, расійскія ды польскія.

Свабодны час дапаўняюць таксама музеі, не толькі тыповыя, але і нестандартныя. Напрыклад у мясцовасці Аглона знаходзіцца Музей хлеба, дзе можна пазнаёміцца не толькі з гісторыяй і працэсам выпякання, але і самому актыўна ўдзельнічаць у выпечцы хлеба, так як гэта рабілася дзесяткі і сотні гадоў таму назад.

Добрай альтэрнатывай для тыповага турыстычнага адпачынку з'яўляецца агратурызм. У Латгаліі не толькі многа азёраў, няма вялікай прамысловасці, але захавалася шмат элементаў традыцыйнай культуры. Прыкладам можа быць мясцовая «чорная» кераміка, а ў многіх дамах, былых беларускіх, засталіся такія старыя бытавыя прадметы, як кросны, калаўроты, корабы і г. д. Нярэдкасць, калі гаспадар выпякае ў сваёй хаце хлеб у рускай печцы.

Несумненна, адной з самых вялікіх каштоўнасцей Усходняй Латвіі з'яўляецца прырода – чыстая, без прамысловых забруджванняў, шмат азёраў і рака Дзвіна, якая аб'яднала беларусаў і латышоў. Самай прыгожай часткай ракі лічыцца «Daugavas loki» – лукавіны Дзвіны, якія знаходзяцца паміж Краславай і Дынабургам.



**Высновы.** Бурлівая, супольная балцка-славянская гісторыя спрычынілася да таго, што ў Латгаліі славянская гістарычна-культурная спадчына прысутнічае практычна ў кожным месцы.

Сярод помнікаў славянскай спадчыны трэба пералічыць:

- помнікі архітэктуры – часоў Рэчы Паспалітай, царскага і савецкага перыядаў (вайсковыя пабудовы, сакральныя будынкі, палацы, шляхецкія сядзібы);
- помнікі, прысвечаныя салдатам (польскім і савецкім), якія вызвалялі гэтыя землі ад той ці іншай акупацыі;
- духоўная культура – перад усім легенды, якія захоўваюцца у вуснай традыцыі, галоўным чынам палякаў, але таксама рускіх-старавераў і беларусаў;
- багаццё традыцыйнай культуры, якое выклікана поліэтнічнасцю гэтых зямель (архітэктура хат, прадметы, звязаныя з побытам, напрыклад, з традыцыйным ткацтвам, ці выпечкай хлеба, са святамі).

Усё гэта, а таксама адсутнасць масавага турызму, каштоўнае прыроднае асяроддзе робяць Латгалію цудоўным месцам для развіцця турызму, асабліва агратурызму і экатурызму.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Ābols G.*, 2002, Contribution of History to Latvian Identity, Cēsis.
2. *Apine I.*, 1995, Baltkrievi Latvijā, Rīga
3. *Apine I.*, 1998, Poļi [y:] Mazākumtautību vēstures Latvijā, red. J. Goldmanis, Rīga, C. 157–171.
4. Demogrāfija 2005, 2005, Rīga.
5. *Jēkabsons Ē.*, 1996, Poļi Latvijā, Rīga.
6. Latvijas Statistikas 2005, 2005, Rīga.
7. *Manteuffel G.*, 1879, Inflanty Polskie poprzedzone ogólnym rzutem oka na siedmiowiekową przeszłość całych Inflant. Poznań.
8. *Manteuffel G.*, 2007 (рукапіс 1892), Zarys z dziejów krain dawnych inflanckich czyli Inflant właściwych (tak szwedzkich jako i polskich), Estonii z Ozylią, Kurlandii i Ziemi Piltyńskiej, Kraków.
9. Nacionālās un etniskās grupas Latvijā, 1996, Rīga.
10. Praktyczny przewodnik Litwa, Łotwa, Estonia oraz Obwód Kaliningradzki, 2002, J. Sajdo, M. Masłowski, B. Piotrowski, P. Wójcik, Bielsko-Biała.
11. Przewodnik Litwa, Łotwa, Estonia, 2010, K. Byrtek, M. Jankowiak, K. Popławski, Warszawa.
12. Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich, 1884, red. E. Sulimierski, B. Chlebowski, W. Walewski, T. 4, Warszawa.
13. *Volkovs V.* 1996, Krievi Latvijā, Rīga.
14. *Volkovs V.*, 1998, Krievi [y:] Mazākumtautību vēstures Latvijā, red. J. Goldmanis, Rīga, C. 81–116.
15. *Блеиере Д., Бутулис И., Зунда А.*, 2005, История Латвии. XX век, Рига.
16. *Дундурс К.*, 1968, Краслава, Рига.
17. *Езавітаў К.*, 1927, Беларусы ў Латвіі, Рыга.
18. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, 1994, Т. 2, Мінск.